## ЧАГО Б ВЫ НЕ ДАРАВАЛІ ЎЛАДЗЕ?

АПЫТАННЕ

СТАР.2


# ТУТ І ЦЯПЕР


## КАРНАВАЛЬНАЯ НОЧ

ПАСЛЯВЫБАРЧЫ РЭПАРТАЖ З АКЦЫІ АПАЗІЦЫІ

СТАР.3



**СПЕЦВЫПУСК** **2-8.10.2008 г.**


# ЧАС ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ

## ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ У БЕЛАРУСІ ЗДЗІВІЛІ ЗАХАД, АПАЗІЦЫЮ І... ЎЛАДУ



**УДЗЕЛЬНІК ГАЛАСАВАННЯ** *на выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ. Мінская вобласць, 28 верасня 2008 году.*

Выбары ў ніжнюю палату Нацыянальнага сходу РБ, як сведчыць Цэнтрвыбаркам, адбыліся. Новы парламент без ніводнага апазіцыянера, але і без міжнароднага прызнання ўжо 25 кастрычніка правядзе сваё першае пасяджэнне. Шмат хто з палітыкаў і аналітыкаў гаворыць цяпер, што ўсе гэтыя вынікі галоўнай выбарчай кампаніі-2008 не былі нечаканымі. Але мы мусім з гэтым паспрачацца.

**Нечаканасць першая. Прайгранае пары чыноўніка з АБСЕ**

Пэўна, для Захаду вынікі гэтых выбараў сталі найбольшай нечаканасцю. Апошнім часам адбылося столькі сустрэч беларускіх высокіх чыноўнікаў з кіраўніцтвам краін Еўразвязу, рознымі ўплывовымі структурамі ЕЗ і Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы, столькі было зроблена аптымістычных заяваў пра паляпшэнне выбарчых умоваў у Беларусі, што яе чакалі ўжо ледзь не ў лістападзе ў Парламенцкай Асамблеі. Больш за тое, у вядомай польскай газеце Rzeczpospolita гаварылася, што ў будучы беларускі парламент патрапяць аж 22 апазіцыянеры. У асяроддзі саміх апазіцыянераў называлася больш сціплая лічба – каля 5 прадстаўніікоў ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС). Але атрымалася, як вядома, поўнае зэро.

Падчас асабістай сустрэчы з адным з супрацоўнікаў Парламенцкай Асамблеі пасля галасавання 28 верасня той прызнаўся мне, што ён і яго калегі ніякім чынам не прагназавалі такога выніку выбараў у Беларусі…

Назіральнік ад АДС у выбарчай камісіі Брэсцка-Усходняй акругі №3 **Мікалай Коўш** распавёў карэспандэнту нашай газеты, што да апошняга не верыў у верагоднасць непрызнання АБСЕ выбараў у Беларусі недэмакратычнымі:

— *Мае чатыры асабістыя сустрэчы з назіральнікамі Арганізацыі бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе гаварылі аб тым, што гэтая арганізацыя ўсур'ёз настроена на прызнанне будучага беларускага парламенту. Я нават заключыў пары з адным з гэтых назіральнікаў, што ў Палату Прадстаўнікоў пройдуць выключна прадстаўнікі "вертыкалі". Упэўнены, што пасля абвяшчэння папярэдніх вынікаў выбараў пра гэтае пары ўспаміналі не адзін і не два супрацоўнікі АБСЕ.*


*Заканчэнне на стар.4*



## СФАРМУЕМ ПАРАДАК ДНЯ БЕЛАРУСІ

ПАЛЕМІЧНЫ АРТЫКУЛ СТАР. 6

## ЯК АДЗНАЧЫЦЬ 20-ГОДДЗЕ БНФ?

ВАШЫ ПРАПАНОВЫ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

# ЧАГО Б ВЫ НЕ ДАРАВАЛІ ЎЛАДЗЕ?

**ВОЛЬГА КАЗУЛІНА, ЭКС-КАНДЫДАТКА Ў ДЭПУТАТЫ:**

## “НЕ ДАРУЮ ЗНІКНЕННЯ ЛЮДЗЕЙ”

Я не дарую знікнення людзей. Не дарую гвалтоўных метадаў у адносінах да апанентаў улады. Пачынаючы ад рэпрэсіяў, пасадак у турмы і скначаючы забойствамі.

**АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА, КУЛЬТУРОЛАГ:**

## “Я НЕ СУД І НЕ ПРАКУРОР”

Нејак гэта дзіўна – не даравацьуладзе. Я б хацеў, каб у нас быў зусім іншы палітычны рэжым. І, напэўна, гэта адзінае, што ў дачыненні да сённяшняй улады я дакладна ведаю. Яна мусіць саступіць месца іншай. Яна вядзе нас у тупік. Краіна страчвае мажлівасць развіцця. І пры чым тут дараваць ці не дараваць? Я не ведаю такой сітуацыі, каб я камусьці штосьці не дараваў. І што значыць “не дараваў”? Гэта вечная прага помсты? Але я не Бог. І не міжнародны суд. І не пракурор. Я хрысціянін. І што? Я мушу прагнуць, каб вечна доўжыліся пакуты грэшнікаў? Нельга жыць увесь час у канфрантацыі. На барыкадах можна змагацца. Але жыць нельга.

**НАТАЛЛЯ, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## “МЫ ЎСЁ ПРАГЛЫНЕМ”

Нельга дараваць трымання насельніцтва ў стане вечнага няведання сваіх правоў. З-за чаго мы з-за любой нагоды ператвараемся ў сляпых кацянятаў у любой канторы. Нас можна звольніць, нам можна прадаць няякасны тавар, нас можна абы як лячыць. Нам можна хаміць. А мы ўсё праглынем і ўтрэмся.

**ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН, ПАЭТ:**

## “МНОГАЕ ЁЙ НЕ МАГУ ДАРАВАЦЬ”

Пытанне зададзена так, як быццам можна многае ёй дараваць. А я хацеў бы многае ёй не дараваць. У першую чаргу, я не дараваў бы нашай уладзе тое, што яна хоча зрабіць нейкую незразумелую дзяржаву, якая б абавязкова не была Беларуссю. Я не магу дараваць уладзе, бо яна здзекуецца з мовы, з культуры, з гісторыі. Прывучае людзей да гістарычнага і нацыянальнага бяспамяцтва. Пачынаючы са школы, вытручвае нацыянальныя традыцыі. Адрывае малых беларусікаў ад дзядоў-прадзедаў, не даючы ім з дзіцячых гадоў адчуць прыгажосць роднай мовы… І астатняга я не магу ёй дараваць. Не магу дараваць Міністэрству адукацыі, не магу дараваць Міністэрству інфармацыі, Міністэрству культуры. Калегам маім, якія працуюць на БТ, на радыё, у выдавецтвах. Як я магу дараваць тое, што яны знішчаюць, як арганізацыю, можа, самую аўтарытэтную і паважаную ў гісторыі беларускай літаратуры арганізацыю – Саюз беларускіх пісьменнікаў? Не даюць магчымасці друкавацца найлепшым нашым паэтам і празаікам. Як можна гэта ўсё дараваць?

**АНТОН АСТАПОВІЧ, СТАРШЫНЯ БЕЛАРУСКАГА ДОБРААХВОТНАГА ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ:**

## “НЕЛЬГА ДАРАВАЦЬ ЗНІШЧЭННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДМУРКАЎ”

Таго, што зараз актыўна знішчаецца гістарычная матрыца цэнтру Мінска. Без комплексных навуковых вышукаў, без археалогіі падмуркаў, без даследаванняў. У гістарычным цэнтры машынамі вывозіцца культурны слой. Каб не краналіся археалагічныя пласты, культурныя пласты, каб не краналіся падмуркі, засталася хаця б матрыца. Яна б дазволіла з цягам часу правесці нармальныя аднаўленні гістарычнага цэнтру. Знішчэння гэтай матрыцы дараваць нельга. І без вырашэння гэтай праблемы ў Мінску па ўсёй Беларусі гэтую праблему не вырашыць. У сталіцы ствараюцца схемы і абкатваюцца прэцэдэнты. І ўсё гэта робіцца па адной прычыне. Такое магчыма толькі пры той вертыкалі, якая ў нас ёсць. Калі чыноўнік не нясе адказнасці ні перад кім.

**ВАЛЯНЦІНА, ПЕНСІЯНЕРКА:**

## “КАЛІ ХЛОПЦАЎ ПАШЛЮЦЬ ВАЯВАЦЬ”

Я не дарую ўладзе, калі нашы хлопцы пойдуць кудысьці ваяваць. Не важна куды і ў складзе якой арміі. Ці то расейскай на Каўказе, ці то НАТАўскай у Афганістане. Хопіць. Беларусь навявалася.

**ЗАХАР ШЫБЕКА, ГІСТОРЫК:**

## “КАЛІ ЎЛАДА НЕ АДНОВІЦЬ ПРЫВАТНУЮ ЎЛАСНАСЦЬ”

Я лічу, што нашы беды пачаліся з таго, што бальшавікі зліквідавалі прыватную ўласнасць і зрабілі поўную нацыяналізацыю ўсіх багаццяў. І калі цяперашняе кіраўніцтва не ўзновіць у поўным аб’ёме прыватную ўласнасць, то я і гэтай і наступнай уладзе ніколі гэтага не дарую. Таму што тут самае асноўнае – даць людзям магчымасць мець уласнасць, распараджацца ёю, быць самастойным гаспадаром. На аснове прыватнай ініцыятывы эканоміка уздымецца. І гэта будзе асноўнай платформай і для развіцця культуры, і сацыяльнай сферы і ўсяго астатняга. Гэтая ці іншая ўлада павінна скупіць злачынства бальшавікоў і зрабіць усіх нас прыватнікамі, уладальнікам нейкіх багаццяў. І больш за тое. Я за тое, каб зямлю вярнулі гаспадарам, якія змогуць даказаць, што яны ёю валодалі, і прадпрыемствы. Як гэта ў Літве было зроблена. Для мяне гэта самае істотнае. З уласнасцю будзе іншы чалавек. З іншай ментальнасцю.

**АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН, ЭКС-КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ:**

## “ЗДРАДЫ СВАЙМУ НАРОДУ”

Можна ўсё дараваць. Але нельга дараваць здрады свайму народу. Бо ўлада ўвесь час здраджвае будучыні свайго народа. Яна ўсё зробіць сёння дзеля свайго асабістага панавання, а пра народ не думае.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “НЕ ДАРУЮ СЛЁЗ ДАЧКІ”

У мяне ёсць эсэ пра Аляксандра Лукашэнку. Яно пачынаецца наступным фрагментам. “У панядзелак пасля майскага рэферэндуму 1995 году дачка запытала, як людзі прагаласавалі “пра бел-чырвона-белы сцяг і мову”. Яна толькі ўвайшла ў хату, стаяла нераспранутая з ранцам за плячыма (тады вучылася ў другім класе) і напята чакала майго адказу. З радыё я ўжо ведаў смутныя вынікі рэферэндуму і сказаў праўду… З дзявочых вачэй пырснулі слёзы. Добра, што я быў апрануты на працу і меў усе падставы хуценька схавацца за дзвярыма, бо што б я ёй сказаў, чым бы суцешыў?! Але яшчэ не паспеўшы схавацца за дзвярыма, я ўжо быў поўны, як звон, нянавісці, якая сама сабой загула словамі: “гэтага яму я ніколі не дарую”. З таго дня прамінула ўжо больш як трынаццаць гадоў. Даўным даўно высахлі тыя слёзкі на шчоках маёй дачкі. Але і сёння я гатовы паўтарыць тое самае. Гэтага я яму ніколі не дарую.

# КАРНАВАЛЬНАЯ НОЧ

## СВЯТА ДЭМАКРАТЫІ ЦЯГНУЛАСЯ ЎСЯГО НЕКАЛЬКІ ГАДЗІНАЎ

Прыблізна раз на два-тры гады на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску адбываецца маленькі цуд. Сюды прыходзіць моладзь з бел-чырвона-белымі сцягамі і сцягамі Еўразвязу. Людзі сталага веку прыходзяць разам з сем’ямі, сустракаюцца тут з сябрамі і знаёмымі, якіх даўно не бачылі. А калі й дзе яшчэ ўбачыш побач Аляксандра Мілінкевіча і Аляксандра Казуліна, які прагульваецца з унукам? І галоўнае, ніхто не разганяе, не збівае, не затрымлівае людзей. Такое свята здараецца толькі ў дзень выбараў – прэзідэнцкіх ці парламенцкіх. Дакладней, увечары, калі ў Мінску яшчэ шмат міжнародных назіральнікаў і замежных карэспандэнтаў з фота- і тэлекамерамі.




**ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРАТЭСТУ** *на праспекце Незалежнасці ў беларускай сталіцы. Надпіс на транспаранце па-англійску: “Байкот дыктатуры!” Мінск, 28 верасня 2008 году.*

Гэтым разам, у нядзелю, 28 верасня, народу на плошчы, праўда, сабралася значна меней, чым у сакавіку 2006-га, пасля прэзідэнцкіх выбараў. Дык і выбары ў Палату прадстаўнікоў, відаць, не такая ўжо значная падзея для жыхароў беларускай сталіцы.

Атрымалася, як заўсёды, не столькі акцыя пратэсту супраць несправядлівых выбараў, колькі свята непаслухмянасці. Напярэдадні галасавання кіраўнік дзяржавы зноў палохаў выбарцаў тым, што апазіцыя збіраецца ладзіць Майдан. Ды які там Майдан? “Аранжавая рэвалюцыя” у Кіеве вызначалася выдатнай арганізацыяй, каардынацыяй розных палітычных партыяў і строгай дысцыплінай удзельнікаў акцыяў пратэсту. У цэнтры беларускай сталіцы з таго, што нагадвала Майдан, былі, хіба што, аранжавыя сцягі – з надпісам “Моладзь за Беларусь”.

Лідэрам Аб’яднаных дэмакратычных сілаў з цяжкасцю ўдалося сабрацца на прэс-канферэнцыю, якую апазіцыя традыцыйна ладзіць пасля выбараў на прыступках Дому Белсаўпрофа. Пакуль лідэры АДС заклікалі Захад не прызнаваць сфальшаваныя парламенцкія выбары ды абяцалі засяродзіцца на падрыхтоўцы да прэзідэнцкіх выбараў 2011 году, моладзь на Кастрычніцкай плошчы распачала свой карнавал. Запалілі фаеры, якія звычайна запальваюць заўзятары падчас футбольных матчаў, і рушылі па праспекце Незалежнасці ў бок аднайменнай плошчы, да Дому ўраду, дзе месціцца Цэнтрвыбаркам.

Намёты, якія пачалі былі ўсталёўваць на Кастрычніцкай, забралі з сабой. Пасля кароткага эмацыйнага мітынгу на плошчы Незалежнасці, ля помніка Леніну, вярнуліся назад, пастаялі на прыступках Палаца Рэспублікі і разышліся.

Міліцыі ў той вечар нідзе не было відаць. Тым не менш, міністр унутраных справаў Навумаў прыгразіў удзельнікам акцыі пратэсту сур’ёзнымі непрыемнасцямі ў сувязі з іх “супрацьпраўнымі дзеяннямі”.

Некалі быў такі сярэднявечны звычай – калі падчас вайны войска займала нейкі горад, ён аддаваўся пераможцам на адну ноч, на рабаванне. У сучаснай Беларусі не так. Адразу пасля чарговай “элегантнай перамогі” ўлада дазваляе тым, хто прайграў, крыху пагуляць па горадзе, падыхаць паветрам свабоды. Увесь астатні час улада пануе ў краіне, якую лічыць сваім надзелам, дадзеным ёй на разрабаванне пажыццёва.

Свята дэмакратыі цягнецца нават не ноч, усяго некалькі гадзінаў.

Позна ўвечары ў Мінску былі збітыя некалькі сяброў “Моладзі БНФ”. У той самы вечар у Віцебску невядомыя збілі каля дому вядомага журналіста Ўладзіміра Базана, які быў даверанай асобай аднаго з кандыдатаў у дэпутаты.

Да новай сустрэчы, грамадзяне, – на тым жа месцы, гады праз два.

**С.ПЯТРОЎ**



**МАЛАДЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ** *акцыі пратэсту супраць несправядлівых выбараў. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 28 верасня 2008 году.*

# ЧАС ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ

## ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ У БЕЛАРУСІ ЗДЗІВІЛІ ЗАХАД, АПАЗІЦЫЮ І... ЎЛАДУ

*Заканчэнне. Пачатак на стар.1*

*Думаю, тут сваю ролю адыгралі нашы звесткі аб сур'ёзных парушэннях падчас гэтых выбараў. Напрыклад, паўсюль у Брэсцкай вобласці датэрмінова ў прымусовым парадку заганялі на выбарчыя ўчасткі студэнтаў, супрацоўнікоў асобных дзяржаўных устаноў. Лічбы тых, хто галасаваў за новых дэпутатаў ад нашай вобласці, выклікаюць здзіўленне нават у людзей, настроеных даволі лаяльна да ўлады.*

Кандыдат у дэпутаты ў Кобрынскай выбарчай акрузе №12 ад Беларускага народнага фронту **Аляксандр Мех** падчас гэтай выбарчай гонкі набраў, паводле афіцыйных звестак, 9,2 адсоткаў галасоў, хаця, па інфармацыі яго назіральнікаў, ён павінен быў выйсці ў другі тур выбараў разам з... дэпутатам Віктарам Кучынскім, які нечакана "праляцеў" гэтым разам:

*— Толькі ў нашай акрузе мы сабралі столькі фактаў парушэнняў заканадаўства, што і гэтага б хапіла для непрызнання міжнароднай супольнасцю цяперашніх выбараў у беларускі парламент.*

Палітолаг **Віктар Верас** лічыць, што цяпер гэтая супольнасць знаходзіцца ў пэўнай прастрацыі:

*— Несумненна, у Еўропы і Захаду ў цэлым былі сур'езныя спадзевы на сёлетнюю парламенцкую кампанію ў Беларусі. Перадусім, пэўныя крокі ў паляпшэнні выбарчага працэсу з боку ўладаў былі ўсё ж зробленыя, але рэальнай канкурэнцыі ўсё адно не адбылося. А адными абяцанкамі-цацанкамі міжнародную супольнасць не ўсцешыць.*

**Нечаканасць другая. Шахматнай дошкай па галаве**

Канечне, Лукашэнка і яго чыноўнікі чакалі міжнароднага прызнання парламенцкіх выбараў, разлічвалі на інтэграцыю ў розныя еўрапейскія структуры, а самае галоўнае, спалі і ў сне бачылі зусім іншы ўзровень эканамічных стасункаў з краінамі аб'яднанай Еўропы і ЗША. І тут такая жорсткая першая рэакцыя з іх боку.

У заяве назіральнікаў АБСЕ 29 верасня адносна папярэдніх вынікаў адзначаецца, што "абяцанні беларускіх уладаў забяспечыць празрыстасць падліку галасоў не былі выкананыя. На 48 працэнтах участкаў, якія наведалі назіральнікі АБСЕ, яны ацанілі працэс падліку галасоў, як "кепскі" ці "вельмі кепскі".

Цікавае меркаванне ў сувязі з гэтым усім выказаў былы старшыня Вярхоўнага Савету 13-га склікання **Мечыслаў Грыб**:

*— Я не разумею Лукашэнку. Пачаўшы гэтую гульню, можна было б працягваць далей. Але ён баіцца нават каго-небудзь дапусціць у гэты парламэнт. Мне падаецца, што ён распачаў гульню ў кірунку Захаду на прызнанне выбараў, а потым сам яе і перарваў, згуляў шахматнай дошкай па галаве.*

**Віктар Верас** лічыць, што нашы ўлады дамагліся таго, што цяпер да іх ставяцца куды больш насцярожана, чым да выбарчай кампаніі:

*— Калі пераводзіць "нечаканасці" парламенцкіх выбараў для ўладаў на больш канкрэтныя рэчы, дык яны зводзяцца да наступнага. Па-першае, Беларусь застаецца краінай-ізгоем на няпэўны тэрмін. Па-другое, аб поўнавартасным эканамічным супрацоўніцтве (сур'езныя інвестыцыі, фінансавая дапамога, адмена санкцыяў і г.д.) наўрад ці хто будзе казаць у бліжэйшай перспектыве. Па-трэцяе, зменшыць сваю палітычную і эканамічную залежнасць ад Расіі не выпадае.*

Да высноваў палітолага застаецца дадаць толькі, што паездка ў Парыж, аб якой марыла вясной гэтага году старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына, пакуль адкладаецца...

**Нечаканасць трэцяя. "Такога блізка не было ў 2004-м..."**

Частка апазіцыі цяпер б'е сябе кулакамі ў грудзі і енчыць пра дарэмнасць свайго ўдзелу ў "выбарчым фарсе". Але ня́мала і тых, хто займаўся рэальнымі выбарчымі справамі, і цяпер падсумоўвае становучыя, і ў нечым нечаканыя вынікі для сябе і сваіх камандаў.

**Аляксандр Мех** напярэдадні выбарчай кампаніі страціў працу, новую пакуль не знайшоў, але вынікамі свайго ўдзелу ў гэтай кампаніі задаволены:

*— Самае галоўнае, я і мае людзі, што называецца, на месцах убачылі, што людзі цяпер куды больш прыязна ўспрымаюць альтэрнатыўны ўладнаму погляд на палітычныя і эканамічныя працэсы ў краіне. Прычым, сваю незадаволенасць праўладным курсам выказваюць самыя звычайныя выбаршчыкі ў вёсках, дзіцячых садках, на механізаваных дварах і г.д. Што дзіўна, такога і блізка не назіралася, напрыклад, у 2004 годзе. Пасля падвядзення вынікаў галасавання, згодна якому дэпутатам ад нашай акругі стаў стаўленік гарадскіх уладаў Аляксандр Засуля, мне тэлефануюць ледзь не цэлымі пад'ездамі, дамамі, працоўнымі калектывамі. Людзі абураны такім падлікам галасоў.*

Шмат хто з АДС не чакаў падобнага эфекту ад гэтай выбарчай кампаніі і рабіў стаўку на байкот, які, дарэчы, так і не адбыўся.

Аляксандр Мех перакананы, што кіданні-хістанні з байкотам толькі прынеслі шкоду:

*— Нямала моладзі было адцягнута ад выбарчага працэсу, ад прапаганды нашых поглядаў. Між тым, толькі ў маю каманду пасля гэтых выбараў прыйшлі каля 40 чалавек...*

Сябра бюро ЦК Партыі камуністаў Беларускай, кандыдат у дэпутаты ў Сенненскай выбарчай акрузе №30 ад ПКБ, Сяргей Вазняк салідарны з меркаваннем свайго калегі:

*— У Сенненскім і Лёзненскім раёнах, дзе няма ніводнай нашай пярвічкі, дзе часта трапляеш у самую натуральную глуш, 4 гады назад мяне за нязгоду з курсам Аляксандра Лукашэнкі мясцовыя жыхары проста забілі б. Цяпер людзі, якія ў сярэднім атрымліваюць у месяц 200 тысяч рублёў (настаўнікам за дзень абавязковай "ільняной адпрацоўкі" плацяць аж 1,5 тысячы рублёў!), з вялікай цікавасцю ўспрымаюць альтэрнатыўную інфармацыю і ўжо з насцярогай ставяцца да прадстаўнікоў нават вышэйшых уладаў. Разам са мной балатаваўся намеснік кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Аляксандр Папкоў, дык яго вельмі многія мае выбаршчыкі ўвогуле не ўспрымалі. Мне тэлефанавала жанчына ў слязах з Талачына, якая лічыць, што яе і многіх знаёмых нахабна падманулі, абяцала скласці спіс тых, хто прагаласаваў за Вазняка ў Талачыне... Усё гэта моцна нагадвае сітуацыю з КПСС у 1989-1990 гадах, калі яна хутка страчвала падтрымку ўнізе.*

Сам Вазняк таксама перадаў шмат цікавай інфармацыі міжнародным назіральнікам. Ён літаральна схапіў за руку двух сяброў участковай камісіі, якія выдалі выбарчыя бюлетэні для цэлай брыгады малочнай фермы ў весцы Ходцы... брыгадзіршы Фаіне Ананенка. У справу вымушаны быў умяшацца мясцовы пракурор.

Кандыдат ад АДС у Шклоўскай выбарчай акрузе №90, былы кіраўнік камунальнай гаспадаркі Шклова **Рыгор Кастусёў** падсумаваў:

*— Людзі зацюканыя афіцыйнай прапагандай. Іншай інфармацыі яны не чулі цягам некалькіх апошніх гадоў. Таму я адназначна ўпэўнены, што нам, прадстаўнікам розных партый, трэба ісці да людзей. Трэба ехаць, бо ў некаторых месцах пра нас ужо забыліся.*

**ВІКТАР ПУШЫНОВІЧ**

Гаспадарка

# СКАЖЫ МНЕ, ШТО ТЫ ЯСІ, І Я СКАЖУ ТАБЕ, ХТО ТЫ

**Указам Аляксандра Лукашэнкі вызначаныя сезонныя мыты на гародніну, якая ўвозіцца ў Беларусь: на свежыя памідоры і агуркі — 50% іх кошту, на цыбулю — 180% , капусту белакачанную — 75%, моркву — 120%, буракі — 150%.**

То бок, імпартная гародніна падаражэе. Зразумела, робіцца гэта дзеля таго, каб абараніць на рынку айчынных вытворцаў сельгаспрадукцыі. Але ў гэтага медаля ёсць і іншы бок: даследаванні паказваюць, што ў апошнія гады беларусы сталі харчавацца хоць і не меней, але горш.

Высокае мыта на ўвоз дазволіць узняць цэны, дарэчы, і на айчынныя прадукты. Бульбу беларускай вытворчасці прадаюць з машынаў па 700 рублёў за кілаграм. (Гэта недзе каля трыццаці амерыканскіх цэнтаў.) А ў Германіі яна каштуе 25 цэнтаў – прыкладна 500 рублёў. Аднак з новымі мытамі завозіць нямецкую бульбу будзе ўжо нявыгадна. А значыць, пры адсутнасці канкурэнцыі, можна ўзнімаць цэны на сваю.

Дзяржава абараняе аграрыяў мытамі і таннымі крэдытамі. А ў выніку цэны толькі растуць. Напрыклад, у Польшчы яблыкі сёлета каштавалі 20 грошай за кілаграм. Гэта каля 180 беларускіх рублёў. Вось і параўнайце з цэнамі ў Беларусі!

Беларускаму пакупніку даводзіцца эканоміць на соках, садавіне, вітамінах. І гэта ўжо ператвараецца для нацыі ў сапраўдную праблему. Паводле эканаміста, кіраўніка Аналітычнага цэнтру "Стратэгія" Леаніда Заікі, у Беларусі, у параўнанні з суседнімі краінамі, танней каштуюць толькі тры віды харчовай прадукцыі: гэта хлеб і хлебабулачныя вырабы, малако ды крупа – пшонка, манка і гэтак далей.

Вось і даводзіцца сядзяць на кашы з малаком. Ну, і бульбе, зразумела. Пражыць, канечне, можна. Але для нармальнага здаровага чалавека патрэбна іншая ежа.

У краінах Еўразвязу дзіцёнак у сярэднім за год выпівае 80 літраў сокаў, а ў нас – 12. Тое самае тычыцца гародніны і садавіны – мы вельмі мала іх спажываем, таму і хварэем часцей за еўрапейцаў. У нас структура харчавання пасунутая ў бок макаронаў, бульбы, хлеба. Ямо тое, што танней. Апошнім часам сталі меней есці мяса й рыбы.

У рацыёне беларуса не хапае садавіны, гародніны, зеляніны. Пераважаюць тлушч і рафінаваныя вугляводы. Да такой высновы прыйшлі беларускія лекары, вывучаючы цягам апошніх гадоў характар харчавання дарослага і дзіцячага насельніцтва краіны. Паводле разлікаў спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтру гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, калі ў сярэднім каларыйнасць харчавання дарослага чалавека павінна складаць 2 — 2,2 тысячы кілакалорыяў, дык аптымальны рацыён выглядае так: да 40% яго займаюць крупы (найлепш, грэчка, аўсянка, рыс), хлеб грубага памолу, макароны, бульба. До 35% адводзіцца гародніне і садавіне. На долю бялковай групы прадуктаў прыпадае да 20% — малако, сыр, кефір, ёгурт, курынае мяса, ялавічына, яйкі, прадукты з соі. Прыкладна 5% — тлушч усіх відаў і цукар (у тым ліку, у кандытарскіх вырабах, цукерках, марожаным і г.д.). Але для такога рацыёну патрэбны зусім іншыя даходы, пра якія сяряднестатыстычны беларус можа толькі марыць.

Так што параўнанне прадуктаў на стале ў беларусаў і ў нашых суседзяў – не на нашу карысць. А некаторыя айчынныя эканамісты ўжо ахрысцілі рацыён жыхара РБ "меню ваеннага камунізму".

**АЛЕГ МАН**

СМІ

# ПОДЗВІГІ ЧЭКІСТАЎ

## АБО "КАРТИНКИ В ТВОЕМ БУКВАРЕ"

У "Советской Белоруссии" нехта Тацяна Грынкевіч абураецца тым, што замала ў дзяржаўным гандлі афіцыйнай сімволікі. Не хапае ёй чырвона-зялёных значкоў, сцяжкоў і партрэтаў любімага мужчыны. Напэўна, усе раскупілі.

*"Оказывается, что интересующие меня товары–символы на заводских складах есть. Но почему–то в звене производители — торговля случаются сбои. Может, государственная символика не очень интересует государственную торговлю из–за надбавки, ограниченной 10 процентами? Да, с такой "маржей" показатели по товарообороту и прибыли выполнять проблематично. Экономический аргумент мог бы показаться сильным... Но его опровергают частные магазины, которые в хорошем темпе заполняют недостаток предложения. Именно в частных "Канцтоварах" в Барановичах я обнаружила в продаже изготовленные в Гродненской типографии "дефицитные" бумажные флажки. Обрадовалась и сразу купила один для своего кабинета — пусть красуется на моем рабочем столе.*

*Кто–то, может, и подумает: "Зачем цепляться к "мелочевке", есть ведь вещи более насущные!" Не соглашусь. Помните знакомое с детства "С чего начинается Родина? С картинки в твоем букваре..."? За сорок лет, прошедших с того времени, как были написаны эти патриотические куплеты, изменились и картинки в букваре, и страна, в которой мы живем, и ее символика. Но одно, на мой взгляд, осталось неизменным.*

*Родина, чувство патриотизма начинаются с фрагментарных деталей. Но "мелочей" здесь быть не может. На том стою. И потому считаю, что в торговле всегда должны присутствовать товары с национальной символикой. В широком ассортименте и по доступным ценам".*

З тых часоў, пра якія так сумуе Грынкевіч, не так шмат і змянілася. Прынамсі, і мілыя яе сэрцу колеры, і каструбаватая мова чынавенства, і хамства абслугі, усё засталося на сваіх месцах. Што ж тычыцца нацыянальнай сімволікі, дык яе сапраўды, пагаджуся з Грынкевіч, не так шмат. Высілкаў аднаго "Маладога фронту" тут яўна замала.

А самая беларуская з усіх афіцыйных газет — "Звязда" з захапленнем знаёміць чытача з навінкамі кніжнага рынку. "Чэкісты расказваюць пра сябе". Так называецца нататка пра новую кніжку.

*"Па абавязку, гонару і прызванню. Старонкі гісторыі Упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці". Яе прэзентацыя адбылася ў музеі ваеннай і баявой славы абласнога цэнтра. Як было адзначана, мерапрыемства гэта прымеркавана да чарговай гадавіны з дня нараджэння Фелікса Дзяржынскага, чалавека, які стаяў ля вытокаў органаў ВЧК-КДБ.*

*(…) чытач зможа па-новаму асэнсаваць многія факты і падзеі, пачынаючы з перыяду станаўлення чэкісцкіх органаў у суровыя дваццатыя гады мінулага стагоддзя. А гэта і супрацьстаянне акцыям іншаземных разведак, і барацьба не на жыццё, а на смерць з крымінальным і палітычным бандытызмам, у тым ліку з вялікімі воінскімі фарміраваннямі Булак-Булаховіча. З цікавасцю, напрыклад, будуць чытацца дэталі аперацыі (...) па знішчэнні арганізацыі Барыса Савінкава "Народны саюз абароны радзімы і свабоды", вядомай як "Сіндыкат-2".*

Змаганне з арміяй Булак-Балаховіча і Савінкавым – гэта, безумоўна, светлыя старонкі дзейнасці чэкістаў. А што ж не пахваліліся нашчадкі жалезнага Фелікса сваімі подзвігамі ад 1929-га па сённяшні дзень? Няўжо сціпласць замінае? Напэўна, гэтую старонку слаўнай дзейнасці за чэкістаў напішуць іншыя гісторыкі.

**АЛЕСЬ КАНЮЦІЧ**

Палеміка

# НА СЦЯЖКУ

## ЯК СФАРМАВАЦЬ ПАРАДАК ДНЯ БЕЛАРУСІ

Вынікі парламенцкіх выбараў у Палату прадстаўнікоў вялікай неспадзянкаю ні для кога не сталі. Але рабіць з гэтага трагедыю, пры той ролі, якую адыгрывае парламент у палітычнай сістэме РБ, не варта.

З другога боку, як фінансавыя крызісы час ад часу здараюцца ў сусветнай эканоміцы, ачышчаючы шлях да абнаўлення, гэтак і крызіс сённяшняй апазіцыі ў Беларусі дае магчымасць, так бы мовіць, ачысціцца.

Не важна, якой будзе рэакцыя Захаду на выбары. Важна зразумець, што будзе з нашай краінай далей, якія высновы зробім мы для сябе. І зыходзячы з гэтага, самім сфармаваць парадак дня Беларусі.

Задача сёння бачыцца не ў тым, каб крытыкаваць практыку, якая склалася ў беларускім грамадстве не ад добрага жыцця, працей кажучы, – ва ўмовах дыктатуры. І не ў тым, каб выкрываць уладу, працягваць клікаць людзей "на барыкады". Справа ў тым, што ніякія змены ў грамадстве немагчымыя без зменаў у свядомасці – без таго, каб большасць, ці хоць бы значная частка грамадзянаў не прасякнулася новаю парадыгмай. ("Парадыгма" ў старажытнагрэцкай мове – прыклад, мадэль, узор. Азначае асэнсаванне свету на падставе ідэяў, поглядаў і паняццяў.)

Ідэя, авалодаўшы масай, становіцца матэрыяльнай сілаю, – сцвярджаў Маркс. Наўрад ці матэрыяльнаю, але ясна – для таго, каб нешта памяняць у жыцці, патрэбна ідэя. У нашым грамадстве апошнім часам адчуваецца яўны дэфіцыт. Не прадуктаў, не адзення, не жылля, але найперш – свежых ідэяў.

Выглядае, наспеў час стварыць свайго роду грамадскі клуб, у якім можна было б генераваць і абмяркоўваць актуальныя ідэі. Ён патрэбны не ў процівагу існуючым палітычным партыям ці грамадскім ініцыятывам. І не для таго, каб спрабаваць аб'яднаць усіх дзеля барацьбы з рэжымам. Наадварот, такі клуб мог бы прыняць у свае шэрагі і прадстаўнікоў самых розных слаёў беларускага грамадства, у тым ліку чынавенства.

Самае складанае заўсёды – пастаноўка задачы, альбо задач. Дык вось і трэба, каб такі клуб заняўся распрацоўкай актуальных для беларускага грамадства задач. На пачатку варта было б разгарнуць дыскусію па самых балючых пытаннях рэчаіснасці. На жаль, недзяржаўныя медыі (пра дзяржаўныя не кажу) сёння не ў стане выканаць гэтую задачу, бо маюць вялізныя фінансавыя праблемы і цяжкасці з распаўсюдам. І акрамя таго, яны, як правіла, належаць да таго або іншага палітычнага лагеру, тусоўкі або групоўкі. Усе новыя ідэі ўспрымаюцца гэтымі групоўкамі як чужыя, а значыць, падазроныя.

Завяршэнне сёлетняй выбарчай кампаніі падаецца зручным момантам для абмеркавання такой ініцыятывы. Не вельмі ўдалы досвед стварэння супольнасці чытачоў газеты "Свабода" ўсё ж засведчыў, што да ідэяў, якія выказваліся на яе старонках, схіляецца не так мала людзей. Але "чытацкі клуб", у лепшым выпадку, можа зацікавіць толькі самых чытачоў ці выдаўцоў.

А ёсць жа пытанні, якія цікавяць сёння, без перабольшвання, усіх – ад пытанняў школьнай адукацыі і альтэрнатыўнай энергетыкі да месца Беларусі ў глабальным свеце, яе ўзаемадачыненняў з Расіяй і Захадам, перспектываў уваходжання краіны ў НАТО і ЕЗ.

Адкрыта абмяркоўваючы гэтыя і іншыя пытанні, можна сфармаваць парадак дня Беларусі ў 21-м стагоддзі.

З чаго пачаць? Для таго, каб ідэя клубу (назва яго хай народзіцца падчас дыскусіі) рэалізавалася, трэба, каб за яе выказаліся, паставіўшы свае подпісы, людзі самых розных прафесіяў, узросту і досведу з розных рэгіёнаў Беларусі, якім баліць за яе лёс і лёс сваіх дзяцей ды ўнукаў, і самае галоўнае – якім ёсць што сказаць.

У жаданні абмяркоўваць важныя пытанні грамадскапалітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця няма нічога крымінальнага, тым больш, "экстрэмісцкага". Магчыма, аднак, крытыкаваць новую ідэю стануць рознага роду грамадскія ініцыятывы, фонды і інстытуты. Магчыма, іх эксперты стануць казаць: што гэта за сельскі клуб такі? Мы пра гэтыя пытанні пісалі, мы ўсё гэта даследавалі ўжо сто разоў. Ну, дык калі ласка – пакажыце вынікі.

Часу ў нас застаецца зусім мала. Кажучы мовай шахматыстаў, "беларуская партыя" гуляецца ва ўмовах цэйтноту, на сцяжку.

**А. УЛАСАЎ,**
*галоўны рэдактар газеты "Свабода" з сакавіка 2006-га па верасень 2008 гадоў.*

**Ад рэдакцыі:** А што вы думаеце наконт ідэі грамадскага клубу? Ці хацелі б у такі клуб уступіць? Прысылайце СМС на тэлефон +370-687-42185. Альбо пішыце на адрас edit@vilnia.com.

Слухаючы радыё

# РЫБКА Ў ЧЫСТАЙ ВАДЗЕ

## АЛЬБО АДНО ПЫТАННЕ ДА ЧЫНОЎНІКА

Калісьці мы дзецьмі лавілі рыбу. Выглядала гэта так: мы ўскаламучвалі нагамі глей на дне і кашамі працэджвалі тую каламуць. Як жа былі радыя, калі ўся каламуць сплыве, а ў кашы знойдзецца рыбка. Гэта мне ўспомнілася пасля заканчэння чарговай выбарчай кампаніі. Колькі гучала ўсялякай каламуці – удзельнічаць у выбарах, не ўдзельнічаць, прызнаюць – не прызнаюць выбары... І вось уся гэтая каламуць сплыла. І што засталося? Дзе тая рыбка? Мне могуць запярэчыць: а якой жа ты рыбкі спадзяваўся, які карысны вынік мог быць? Магло б быць разуменне, што такое сапраўдныя дэмакратычныя выбары і дзе сёння мяне падманваюць. Кандыдаты ў дэпутаты маглі б раздаваць не абяцанкі-цацанкі, а нармальныя падручнікі паліталогіі і гісторыі Беларусі, якія б не састарэлі на заўтрашні дзень пасля заканчэння выбарчай кампаніі. А журналісты таксама маглі б у гэтым дапамагчы.

Удакладню сваю думку толькі адным прыкладам. Журналістка Свабоды Ганна Соусь узяла інтэрвію ў намесніка старшыні ЦВК спадара Лазавіка. Было зададзена 10 пытанняў на самыя розныя тэмы. І спрактыкаваны чыноўнік вельмі лёгка адбрахаўся на кожнае з тых пытанняў. А можа варта было б задаць толькі адно пытанне – пра фармаванне ўчастковых выбарчых камісіяў, і калі ён пачаў унікаць прамых адказаў, задаць яму яшчэ 10 пытанняў на гэтую ж тэму і вывесці яго на чыстую ваду?

**СЯРЖУК ВІТУШКА**

Стрэмкі

# ЖАХ ПРАВІЛЬНАСЦІ

## НЕ ЛЮБЛЮ АСОБАЎ, ШТО ПРАВІЛЬНА РАЗЖОЎВАЮЦЬ ЕЖУ

Адна з галоўных рысаў таталітарных грамадстваў – усеагульная правільнасць.

Усё раскрэслена, распісана паводле строгіх правілаў, – права на існаванне мае толькі тое, што карысна вялікай справе пралетарыяту.

Або арыйскай расы.

І ніякіх там "... і з боку банцік".

Правільная музыка, правільная літаратура, правільны жывапіс, правільная сціплая вопратка.

Правільныя "аграгарадкі".

Чаму так пераследаваўся джаз? Бо ў яго аснове імправізацыя, – выдумка, выбрык, капрыз. Палёт.

Не люблю наведваць "дамы-музеі".

Бо гэта не проста дамы людзей, якія памерлі. Гэта – мёртвыя дамы.

Ніколі не бывае ў жывым жытле так усё вымецена, вылізана, і ўсё на сваіх месцах.

Нічога немагчыма стварыць у такім інтэр'еры. Як нічога не створыць абсалютна правільная асоба.

Гэта потым іх жыццярысы выдаюцца ў серыі "Жизнь замечательных людей". А пачытаеш – чым больш творца "замечательный", тым большы, як кажуць палякі, "skurwysyn". Хам, п'яніца, бабнік.

Бяда толькі – сукіных сыноў шмат, а творцаў – мала.

Аднак калі б правілаў не стала ўвогуле – што б тады парушалі?

Напрыклад, у так званым "сучасным мастацтве" адменены ўсе і ўсякія правілы. Таму там пануе такая нудота.

Што можа быць больш нецікавым, чым дазволены бунт? Правільная няправільнасць.

Але "правільнасць" уласціва не толькі дыктатурам. Яна сама можа стаць дыктатарам. Пад назваю "функцыянальнасці".

Старыя гарады і вёскі забудоўваліся ў даўнія часы стыхійна – як падабалася ўласніку. На колькі яму дазвалялі сродкі і амбіцыі, так ён і будаваў свой дом ці палац. І ў вёсцы кожны, як умеў, выштукоўваў сваю хату.

Новыя гарады – мёртванароджаныя.

Старыя раслі, як раслі дрэвы – разгаліноўваліся паводле сваіх унутраных патрэбаў.

Новыя гарады – муляжы, тут усё сканструявана абстрактна-тэарэтычна.

Архітэктурнае бюро "Пракруст".

Таму ў іх так цяжка жывым людзям.

Жыццё – гэта не адсутнасць усіх і ўсялякіх правілаў. Жыццё – гэта жывыя правілы. Якія немагчыма сабраць, упісаць, уціснуць ні ў якую ўсеабдымную, адну на ўсіх, канстытуцыю.

Быў у мяне сябар. Ружовашчокі весялун, аматар жаночага полу, не дурань выпіць і закусіць. Нядаўна сустрэў яго і не пазнаў. Цяпер ён усміхаецца ветліва і добразычліва. Мае жонку, якая носіць акуратную шэрую сціплую спадніцу і гэткі ж твар. І абодва гавораць цытатамі з Вялікай Правільнай Кнігі.

Давялося прынесеную пляшку "Тры дзявяткі" расціснуць у іншым месцы з іншым чалавекам.

Вам не даводзілася чытаць, як трэба правільна есці?

"Пищу следует пережевывать тщательно, продолжительное время, пока она не превратится в жидкую кашицу, пропитанную слюной".

Як агню баюся і пазбягаю як заразы асобаў, што правільна разжоўваюць ежу, правільна любяць Радзіму, правільна і цэнзурна гавораць і пішуць (фразу "аднакласніца ў калготках" абавязкова паправяць на "аднакляcьніца ў кальготках"), ніколі не напіваюцца, ніколі не гавораць глупстваў жанчынам. Ніколі не парушаюць сёмага прыказання. Ніколі...

Як жа іх не люблю!

**АЛЕГ АБЛАЖЭЙ**

Факты жыцця

# СОННАЕ ЦАРСТВА

Зранку ў дзень выбараў да мяне зайшоў сусед і папрасіў тачку, — каб забраць бітую тратуарную плітку, якую выкінулі будаўнікі. Сусед распавёў, што за апошні месяц зарабіў два мільёны беларускіх рублёў, а на "Дажынках" пагуляў разам з каханай на 17 тысяч – з'елі сардэлькі з капустай і хлебам, але не выпівалі, бо ён закадзіраваны і таму культывуе здаровы лад жыцця ...

А дзясятай раніцы выйшла ў горад, каб зайсці на бліжэйшы выбарчы ўчастак. Горад пусты – быццам бы ўсе спяць, ці яшчэ што-небудзь… Любая сітуацыя ў той або іншай краіне мае шмат аспектаў – ідэалагічны, палітычны, эканамічны, сацыяльны. Шмат аспектаў, шмат граняў. Сітуацыі змяняюцца тады, калі адбываюцца падзеі – палітычныя і эканамічныя ў першую чаргу. І толькі падзея змяняе карціну. Як рэакцыя на падзею ўзнікае нешта новае, звязанае з новымі запатрабаваннямі, у тым ліку і з запатрабаваннем новага ўзроўню свабоды.

Дзяржаўная ўлада валодае рэсурсамі: ідэалагічнымі, інфармацыйнымі, эканамічнымі. І няма сіл, здольных супрацьстаяць на роўных той уладзе, якая цяпер існуе. Розныя вагавыя катэгорыі. Апазіцыя – гэта найлягчэйшая вага, а дзяржаўная ўлада – суперцяж. Апазіцыя арыентуе людзей на змены, на новае. А ці шмат людзей жадаюць змяняцца, рабіцца іншымі, не тымі, хто яны ёсць на цяперашні дзень?

Зменаў жадае меншасць. І каманда Лукашэнкі, і сам ён адгадалі альбо інтуітыўна адчулі, зразумелі гэта і сказалі: "Не трэба змяняцца, вы і так добрыя! Вы самыя талерантныя, самыя працавітыя… І ўлада ў вас добрая – такая, як вы". Навошта змяняць такую ўладу? Гэтае нежаданне зменаў караніцца ў тым перыядзе, калі людзі на працягу амаль трыццаці гадоў жылі ў так званай "дэфіцытнай эканоміцы". І вось цяпер, калі для меншасці актуальны лозунг "Жыве Беларусь!", для масы насельніцтва падыходзіць лозунг "Жуе Беларусь!" Тавар ёсць, праца ёсць, машыну можна купіць, крэдыт узяць. Ежа ў краме прадаецца. І Беларусь жуе…




**АГІТКАНЦЭРТ** *з удзелам БРСМ. Мінск, 27 верасня 2008 году.*

**АЛІНА СЦЯПАНАВА**

# УСЁ ОК!
## АЛЬБО ФІЯСКА ЛОРДА БЭЛА

Да сёлетняй выбарчай кампаніі і яе прэзентацыі свету ўлады РБ, здавалася, рыхтаваліся грунтоўна. Нават выпісалі з Вялікабрытаніі знакамітага піяршчыка, лорда Цімаці Бэла, які мусіў растлумачыць Захаду, што ў Беларусі "ўсё ОК!"

Ужо падчас выбарчай кампаніі з турмаў былі вызваленыя палітвязні Аляксандр Казулін, Андрэй Кім і Сяргей Парсюкевіч. Такім чынам, была зліквідаваная ці не галоўная перашкода на шляху супрацоўніцтва паміж нашай краінай і Еўразвязам. А за некалькі дзён да выбараў адбылася знакавая падзея – тэлефонная размова паміж Аляксандрам Лукашэнкам і адным з галоўных кіраўнікоў Еўразвязу Хаўерам Саланам, падчас якой бакі гаварылі пра неабходнасць новай старонкі ў адносінах паміж Беларуссю і ЕЗ.

Было відавочна, што існуюць нейкія кулуарныя дамоўленасці наконт прысутнасці апазіцыі ў будучай Палаце прадстаўнікоў. Дзеля іх выканання ад беларускіх уладаў патрабавалася толькі адно: не фальшаваць выбары, прынамсі, паўсюдна, а сумленна палічыць галасы выбаршчыкаў хаця б у некаторых акругах.

Аднак раніцай 29 верасня высветлілася, што ўсе 110 дэпутатаў абраныя ўжо ў першым туры і сярод іх няма ніводнага прадстаўніка апазіцыі.

Мяркую, што ў гэты панядзелак у Брусэлі шмат хто чухаў патыліцу, праклінаючы "загадкавую славянскую душу". Навошта была патрэбная ўся гэтая перадвыбарчая "кадрыль", калі ў апошнюю хвіліну ўсе пагадненні былі парушаныя?

Падобна, што нашы ўлады самі не ведаюць, што зробяць у наступную хвіліну. Сур'ёзныя рашэнні прымаюцца і адмяняюцца пад уплывам нейкіх імпульсіўных парываў.

Мецць справу з такім партнёрам – вялікі галаўны боль.

Дарэчы, падчас выбараў, нарэшце, шырокая грамадскасць пабачыла ўзоры піяр-прадукцыі, якую кампанія лорда Бэла рыхтуе для паляпшэння іміджу Беларусі. Інтэрнэт-газета "Мы" прыводзіць вытрымкі з прэс-рэліза для замежных журналістаў:

"Сёлета Беларусь прыняла новы закон аб СМІ, які ўступіць у сілу 9 лютага 2009 году. Гэты закон спрашчае працэс акрэдытацыі СМІ, гарантуе свабоду слова, абараняе крыніцы журналістаў, спыняе цэнзуру ў СМІ і гарантуе канкурэнцыю. Фактычна ён кадыфікуе бягучую лібералізацыю беларускіх СМІ. У 2006 годзе Беларусь карала медыі 102 разы, а ў гэтым годзе — толькі адзін раз. (Мабыць, маецца на ўвазе знішчэнне асобнікаў газеты "Свабода" у Гродзенскай вобласці ў верасні, што былі абвешчаны "экстрэмісцкімі"? – рэд.) Поўныя жыцця свабодныя СМІ забяспечаць дэмакратычныя правы народа Беларусі...

Беларусь імкнецца да дабрабыту ўсіх грамадзян. Улады не праводзяць адрозненняў паміж правамі кожнага грамадзяніна незалежна ад полу, групы або рэлігіі. Урад жадае, каб усе беларусы дабіліся поспеху і адыгрывалі поўную ролю ў грамадстве..."

Нават не дыскутуючы наконт праўдзівасці гэтых выказванняў, варта запытацца: а ці трэба было дзеля такіх "крэатыўных" пасажаў наймаць замежную кампанію і плаціць ёй за гэта шалёныя грошы? Няўжо айчынныя майстры прапаганды дэградавалі ўжо да такой ступені, што самі не ў стане напісаць штосьці кшталту "Беларусь імкнецца да дабрабыту ўсіх грамадзян"...

**АЛЯКСЕЙ СУДЗІЛОЎСКІ**




**ПАЛІТЫЧНЫ ПІЯР** *існаваў задоўга да таго, як з'явіўся сам гэты тэрмін. Майстрам такога піяру быў савецкі мастак Барыс Яфімаў, які памёр 1 кастрычніка ў Маскве. Ён лічыцца стваральнікам унікальнага жанру ў карыкатуры — "станоўчая сатыра". Барыс Яфімаў (Фрыдлянд) нарадзіўся 28 верасня 1900 году ў Кіеве. Яго старэйшы брат – журналіст газеты "Известия" Міхаіл Кальцоў быў арыштаваны па загадзе Сталіна ў 1937 годзе (расстраляны ў 1940-м). Гэта не перашкодзіла Барысу Яфімаву друкаваць карыкатуры ў той самай газеце. Цягам свайго доўгага жыцця мастак удзельнічаў практычна ва ўсіх палітычных кампаніях савецкага рэжыму. Эфектыўнасці тых кампаніяў у стварэнні іміджу СССР і яго правадыроў на Захадзе мог бы пазайздросціць і сам лорд Бэл. Плакат "Жыць стала лепей, жыць стала весялей" быў напісаны ў 1936 годзе.*

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ НАШУ ГАЗЕТУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС (ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА, ІНДЭКС, ГОРАД, РАЁН, ВОБЛАСЦЬ) SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM.
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ НАШУ ГАЗЕТУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.SVABODABY.NET.
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ ГАЗЕТЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактор** С. Пятроў **Падпісана ў друк** 00:27 02.10.08
Тыраж 299 экзэмпляраў